3. Самонов Ю. «Американские горки» на пути к рецессии / Ю. Самонов // Эксперт. – 2007. – 3-9 сентября. – № 32 (573).
4. Хвостик Е., Аскер-заде Н. Ипотечный кризис заразил все континенты / Е. Хвостик // КоммерсантЪ. - 2007. – 31 августа. – № 157 (3733).
5. Чайкина Ю., Хвостик Е., Дорофеева А. Банк Англии скупает кризис / Ю. Чайкина // КоммерсантЪ. – 2007. – 19 сентября. – № 170(3746).
6. Шитов, А. Американская мечта дала трещину. / А.Шитов // Российская газета. – 2007. – 12 сентября. – №4472.
7. Исландия не хочет платить. // Белорусы и рынок. – 2010. – 11 января. – № 2. – С. 18.
8. Проблемы ипотеки возвращаются. // Белорусы и рынок. – 2010. – 30 августа. – № 32. – С. 20.

## СПЕЦДАНЯСЕННІ АДПУ/НКУС ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ ШТОДЗЁННАСЦІ РАБОЧЫХ г. ВІЦЕБСКА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ 1930-х гг.

**А.М. Дулаў**
*Віцебск, ВДУ*

У беларускай савецкай гістарыяграфіі створаны вялікі комплекс прац, прысвечаных рабочаму класу, у тым ліку ў перыяд першых пяцігодак. Аднак у гэтых працах на фоне глабальных працэсаў губляецца “маленькі чалавек” з яго паўсядзённымі клопатамі і перажываннямі, а узаемаадносіны яго з уладай паказаны выключна ў кантэксце шчырай падтрымкі і рэалізацыі рашэнняў партыі і ўрада. У святле працэсу антрапалагізацыі гістарычных даследаванняў вывучэнне сферы паўсядзённага жыцця рабочых у надзвычайных умовах індустрыялізацыі ўяўляецца важнай і актуальнай задачай.

Адной з крыніц для даследавання штодзённасці рабочых выступаюць спецданясенні (спецсводки) АДПУ/НКУС, якія рыхтаваліся з мэтай давядзення да мясцовага і цэнтральнага партыйнага кіраўніцтва інфармацыі пра матэрыяльна-бытавое становішча працоўных і іх адносіны да партыйна-дзяржаўнай палітыкі. Спецданясенні 1930-х гг. утрымліваюць разнастайныя звесткі, дазваляюць пачуць (праўда, праз пасрэднікаў – даносчыкаў і агентаў) жывыя галасы людзей таго часу, адчуць дух эпохі. Зыходзячы з таго, што ў такіх дакументах пераважае негатыўная інфармацыя, трэба мецць на ўвазе, што яны не адлюстроўваюць ўсю разнастайнасць жыццёвых з’яў і настрояў.

Спецданясенні мясцовых спецслужб часткова адкладаліся ў фондах партыйных камітэтаў. Мэта дадзенай работы: вызначыць інфармацыйны патэнцыял спецданясенняў АДПУ/НКУС як крыніцы па гісторыі штодзённасці працоўных прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці г. Віцебска першай паловы 1930-х гг. Асновай паслужылі матэрыялы фонда Віцебскага гарадского камітэта КПБ (102-п). Пры цытаванні захаваны стыль і пунктуацыя крыніц. Пад штодзённасцю мы, услед за Ш. Фіцпатрык, разумеем пераважна паўсядзённыя узаемадачыненні, якія ў той ці іншай ступені ўключаюць удзел дзяржавы [1, с. 9].

Спецданясенні дазваляюць адчуць складанасць становішча, у якім апынуліся рабочыя падчас індустрыяльнага рыўка. Працаваць даводілася не ў лепшых умовах. Распаўсюджанай з’явай на віцебскіх прадпрыемствах было парушэнне нормаў аховы працы. Напрыклад, у дакуменце 1932 г. адзначана, што на швейнай фаб-

Репозиторий ВГУ

рыцы “Сцяг індустрыялізацыі” не дзейнічала сістэма вентыляцыі, у цэхах было цесна і душна, “в уборных постоянно болото и грязь” [2, арк. 274].

Аналіз крыніц сведчыць, што ўведзеная ў 1931 г. усесаюзная карткавая сістэма працавала неэфектыўна. Карткі, чэргі, дэфіцыт, напаўгалоднае існаванне з’яўляліся характэрнымі рысамі жыцця працоўных на працягу першай паловы 1930-х гг. У 1932 г. тарыфныя стаўкі аплаты працы на віцебскіх прадпрыемствах і нормы выдачы хлеба былі зніжаны. Альтэрнатывай мог выступіць рыначны гандаль, аднак у такім выпадку месячнага заробку хапіла б на некалькі дзён. У 1932 г. ў Віцебску пачаліся перабоі з выдачай хлеба. Падобныя праблемы захоўваліся і ў наступныя гады. З канца 1933 па люты 1934 г. рабочыя швейнай фабрыкі “Профінтэрн” не атрымлівалі крупы і бульбу. У лютым ЗРК (закрыты рабочы кааператыў) выдаў ім толькі цукар і павідла, а ўдарнікам дадаткова – печыва, мыла і цукеркі [2, спр. 283, арк. 27]. Хоць неяк кампенсаваць такія цяжкасці павінны былі сталоўкі прадпрыемстваў. Аднак яны гэтаксама адчувалі недахоп прадуктаў, да таго ж часта знаходзіліся ў антысанітарных умовах.

Сітуацыя выклікала вялікую незадаволенасць рабочых. У выказваннях, што цытуюцца ў спецданясеннях паводле даносаў і агентурнай інфармацыі, засведчана разуменне некаторымі прадстаўнікамі рабочага класа сапраўдных прычын голаду. Напрыклад, работніца фабрыкі “Сцяг індустрыялізацыі” К. у красавіку 1932 г. выказалася: “Вся беда в том, что у нас сплошная коллективизация, еще будет хуже, ночью после работы было открытое партсобрание, где стоял вопрос о хлебе, но на собрании дали неверное объяснение о снижении норм, это не потому, что недостаток хлеба на Украине, а потому что сплошная коллективизация…” [2, арк. 159]. Работніца льнопрадзільнай фабрыкі “Дзвіна” С. у 1934 г. выказала думку, што “… у нас только глаза рабочим затемняют, говоря, что о них заботятся , а на самом деле все за границу отправляют, а рабочий с голоду дохнет и никто внимание на это не обращает” [2, спр. 282, арк. 35].

У некаторых выказваннях засведчана настальгія па дарэвалюцыйных часах ці перыядзе нэпа, параўнанне са становішчам у суседняй Польшчы. Так, работніца “Сцяга індустрыялізацыі” М. у кастрычніку 1931 г. выказалася пасля абеду ў прысутнасці 10–12 работніц, што “… в Польше живут куда лучше, чем мы… Там все дешево и вы можете достать без карточек и очередей, всё там есть…” [2, арк. 376].

Рабочыя выказвалі незадаволенасць адміністрацыяй, заробак прадстаўнікоў якой у разы перавышаў заробкі працоўных, і якія атрымлівалі пайкі адказных работнікаў. У Віцебску негатыў да адміністрацыі (“на нашей шее засели, как былые помещики”) пераплятаўся з бытавым антысемітызмам [2, арк. 373].

У спецданясеннях адлюстраваны пасіўны супраціў рабочых уладзе: ігнараванне афіцыйных святаў і кампаній, кшталту падпіскі на заёмы індустрыялізацыі і латарэі Асаавіяхіма. Так, многія рабочыя віцебскіх прадпрыемстваў, у тым ліку камуністы і камсамольцы, у 1932 г. праігнаравалі першамайскую дэманстрацыю. У асяроддзі дэманстрантаў можна было пачуць: “Ты думаешь, рабочие идут на демонстрацию с желанием, ничего подобного, просто в силу необходимости, чтобы после не скулили, что, мол, не пошли на демонстрацию” [2, арк. 135–136].

Характэрна, што жанчыны, на якіх ляжала адказнасць за лёс дзяцей, рэагавалі больш эмацыйна, што засведчана як у выказваннях, так і ў пэўных стыхійных дзеяннях. Як сведчыць спецданясенне, у маі 1932 г. у Віцебску адбылася стыхійная дэманстрацыя галоднай чаргі жанчын колькасцю больш за 100 чалавек у накірунку хлебазавода з патрабаваннем выдаць хлеб, якое было задаволена [3, с. 308–309].

Репозиторий ВГУ

З разгортваннем стаханаўскага руху, спецданясенні фіксуюць аспекты паўсядзённага жыцця стаханаўцаў, адлюстроўваюць стаўленне да іх іншых рабочых. Яно нярэдка было адмоўным, бо са стаханаўскімі дасягненнямі звязвалі павелічэнне нормаў выпрацоўкі, а іх прывілеі выклікалі зайздрасць. Часам, рабочыя кпілі са стаханаўцаў. Напрыклад, у кастрычніку 1935 г. на фабрыцы "Дзвіна" рабочы Л. учыніў здзеклівы жарт са стаханаўкі: "в момент её работы взял пустой ящик, поставил около Исаковой, выразившись: "Вот тебе ящик, оправляйся, ведь тебе в уборную ходить некогда" [2, спр. 365, арк. 50].

Такім чынам, спецданясенні АДПУ/НКУС дазваляюць прасачыць уплыў дзяржавы на штодзённае жыццё рабочых лёгкай прамысловасці г. Віцебска першай паловы 1930-х гг. і пратэстную рэакцыю саміх рабочых, вымушаных прыстасоўвацца да надзвычайных умоў жыцця. Аднак, зыходзячы са спецыфікі крыніцы, яна можа быць выкарыстана толькі ў комплексе з іншымі дакументамі эпохі.

ЛІТАРАТУРА

1. Фицпатрик, Ш. Повседневный сталинизм. Социальная история Советской России в 1930-е гг.: город / Ш. Фицпатрик. – Москва: РОССПЭН, 2001. – 336 с.
2. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф. 102-п (Віцебскі гарадскі камітэт КПБ), воп. 1, спр. 113.
3. Яковлева, Г.Н. Женщины Витебщины в период модернизации 1930-х годов / Г.Н. Яковлева, А.Н. Дулов // Женщины в истории: возможность быть увиденными: сб. науч. ст. Вып. 1 / под ред. И.Р. Чикаловой. – Минск: БГПУ им. Максима Танка, 2001. – С. 304–311.

## АТРИБУЦИЯ КАК СРЕДСТВО ПОПУЛЯРИЗАЦИИ ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ (на примере художественного произведения "Письменный стол" Д.П. Штеренберга из коллекции УК "ВОКМ")

**К.А. Дюхова**
*Витебск, ВГУ*

Фонды многочисленных музеев нередко представляют большую ценность и интерес не только в качестве узколокального местного материала, но и в масштабах страны в целом. Из-за отсутствия сводных данных о них в виде публикаций или каталогов многие музейные предметы выпадают из поля зрения заинтересованных учреждений, исследователей, в том числе и самих музейных работников. Без ясного представления об их художественной и исторической ценности невозможно их использование в экспозициях, наконец, их популяризация в рамках приобщения к сокровищам национального искусства широкого зрителя. В связи с этим насущной необходимостью является выявление этих памятников и их атрибуция.

В современном музейном мире художественное собрание УК «Витебский областной краеведческий музей» (ВОКМ) известно в первую очередь коллекциями работ Ю.М. Пэна и И.Е. Репина. Вместе с тем, еще в довоенный период, являясь одним из центров культурной жизни города, ВОКМ обладал первоклассным собранием художественного значения, владение которым было бы желательным для многих современных музеев. И, пожалуй, уникальная коллекция картин «левого искусства» выделялась в этом отношении по своему художественному и историческому значению. В 1925 году коллекция бывшего Музея современного ис-

Репозиторий ВГУ